в более полный кинематографический опыт. На самом деле представление может стать настолько эффективным, что обычные кинозрители осознают, что сцены на экране словно продолжаются, активизированные повествованиями бэнси.

Как, в частности, показывает это утверждение, понимание Мусеем феноменологии восприятия аудитории частично основывается на историческом и культурном прецеденте традиции устного повествования, известной как катаримоно, которая возникла в средневековой Японии и до сих пор встречается в современном исполнительском искусстве и литературе. Возможно, что еще более важно, подчеркивая мультисенсорные измерения фильма наряду с доминирующим изображением, Мусей предвосхищает более поздние важные теоретические утверждения о логике кино Жиля Делеза в его основополагающем исследовании о кино (Cinema 2: The Time-Image, 1985) [3].

Можно утверждать, что произошел радикальный сдвиг в определении кинематографического опыта: теперь речь шла не о прослушивании фильма как просто еще одной формы иллюстрированного повествования, а о просмотре его как кинематографического действа, превосходящего свое время, уникального и неповторимого для киноискусства.

**Литература**

1. Dym, J. A. Benshi and the Introduction of Motion Pictures to Japan / J. A. Dym // Monumenta Nipponica. – 2000. – Vol. 55, № 4. – P. 509–536.
2. Bernardi, J. Routledge Handbook of Japanese Cinema / J. Bernardi, S. T. Ogawa // "Inter-mediating" global modernity: benshi film narrators, multisensory performance, and fan culture / ed. K. Omori. – New York, 2020. – P. 198–212.
3. Deleuze, G. Cinema 2: The time-image / G. Deleuze. – Minneapolis : Univ. of Minnesota Press, 1985. – 364 P.

## Перадумовы стварэння Кітайска-сінгапурскага індустрыяльнага парку «Сучжоў»

*Сасункевіч А. А., магістрант БДУ,*
*навук. кір. ст. выкл. Шаўцоў Ю. В.*

Кітайска-сінгапурскі індустрыяльны парк 12 чэрвеня 2022 г. адзначыць сваё 28-годдзе. Парк прайшоў працяглы шлях ад рысавага поля да сучаснага і высокатэхналагічнага горада.

Сінгапурскі бок жадаў пабудаваць у КНР індустрыяльны парк сусветнага ўзроўню на падставе ўласнага паспяховага вопыту па развіцці прамысловай зоны Джуронг (Jurong Industrial Estate). У 1990-я гг. Кітай змагаўся з санкцыямі, уведзенымі Захадам пасля інцыдэнту на плошчы Цяньаньмэнь

у 1989 г. Ён усё яшчэ знаходзіўся на ранніх этапах эканамічных рэформ. Краіне не хапала капіталу і ведаў аб перадавой міжнароднай практыцы і прынятых тэхнічных стандартах. Кітай імкнуўся эканоміць абмежаваныя рэсурсы для хуткага старту. Аднак у 1994 г. сінгапурскія чыноўнікі павінны былі цвёрда прытрымлівацца ўласных высокіх стандартаў. Гэта звязана з тым, што місіяй Сінгапура было пабудаваць высакакласны індустрыяльны парк, каб, у тым ліку, прадэманстраваць паспяховы досвед і дасягненні Сінгапура ў галіне развіцця.

Дэн Сяапін быў першым кітайскім палітычным дзеячам, які забяспечыў спрыяльныя ўмовы для кітайска-сінгапурскага супрацоўніцтва ў Сучжоў. Поспех Сінгапура як маладой краіны прыцягнуў увагу Дэн Сяапіна ў 1978 г. з пачаткам эпохі «палітыкі рэформ і адкрытасці» ў КНР. У тым жа годзе падчас сустрэчы з Дэн Сяапінам у межах яго візіту ў Сінгапур, прэм'ер-міністр Лі Куан Ю адзначыў, што калі Сінгапур з насельніцтвам, якое складаецца на тры чвэрці з кітайцаў, шмат з якіх з'яўляюцца нашчадкамі непісьменных беззямельных сялян, здолелі дасягнуць пэўнага ўзроўню развіцця, то Кітай з яго працяглай гісторыяй і патэнцыялам можа дасягнуць значна большага. Дэн Сяапін успрыняў гэта як выклік. Падчас афіцыйных паездак па паўднёвых кітайскіх правінцыях у 1992 г. ён адзначыў, што «на працягу наступных 20 гадоў Кітай павінен дагнаць «чатырох азіяцкіх драконаў» (Ганконг, Сінгапур, Паўднёвая Карэя, Тайвань) не толькі ў эканамічнай сферы, але і па ўзроўні развіцця сацыяльнай сферы» [1].

У 1992 г. Сінгапур наведалі некалькі дзясяткаў кітайскіх дэлегацый на афіцыйным і неафіцыйным узроўнях. Іх мэтай з'яўлялася пільнае вывучэнне сінгапурскага досведу развіцця і магчымасць яго наступнага ўжывання ў КНР. Кітайскія дэлегацыі падрабязна вывучалі сінгапурскую сістэму дзяржаўнага і эканамічнага кіравання, інстытуцыйную структуру, юрыдычную сістэму, шляхі барацьбы з карупцыяй і «сацыяльнымі язвамі» (прастытуцыя, алкагалізм, наркаманія, азартныя гульні), спосабы выхавання высокіх сацыяльных і маральных якасцей у простых грамадзян і чыноўнікаў. Члены дэлегацый пасля вяртання ў Кітай складалі справаздачы і рэкамендацыі, якія вывучаліся прадстаўнікамі Камуністычнай партыі.

У гэтым жа годзе Лю Куан Ю ў суправаджэнні намесніка прэм'ер-міністра Сінгапура Онг Тэн Чэонга з афіцыйным візітам наведаў Сучжоў. Паводле ўспамінаў Лі Куан Ю, Сучжоў нагадваў «кітайскую Венецыю» з цудоўнымі садамі, віламі, камянямі і вадаёмамі, аднак сам горад «быў састарэлым, а яго каналы – бруднымі» [1]. У сінгапурскага кіраўніцтва ўзнік план па аднаўленні Сучжоў, у прыгарадзе якога планавалася пабудаваць камерцыйную і прамысловую зону.

Мэр горада Сучжоў Чжан Сіньшэн падтрымаў дадзеную ініцыятыву, прапанаваўшы Лі Куан Ю праінвеставаць 10% ад валютных рэзерваў

Сінгапура ў Сучжоў, каб правесці ў горадзе індустрыялізацыю і мадэрнізаваць яго па сінгапурскім узоры. Для дасягнення дадзенага плана мэру горада было неабходна: 1) пераканаць сінгапурскі бок, што наступнае кіраўніцтва горада зможа забяспечыць неабходны інвестыцыйны клімат; 2) мэрыі Сучжоў было неабходна заручыцца падтрымкай цэнтральнага ўрада.

Пасля выканання гэтых умоў Чжан Сіньшэн сумесна з Лі Куан Ю, віцэ-прэм᾽ер-міністрам Онг Тэн Чэонгам, Дэн Сяапінам і яго сынам Дэн Пуфанам зацвердзілі архітэктурны праект адрэстаўраванага Сучжоў і найбліжэйшага прамысловага горада-сада. У далейшым гэты праект быў прадстаўлены ў Пекіне старшыні КНР Цзян Цзэміню і прэм᾽ер-міністру Лі Пэну [2]. Лі Куан Ю планаваў стварэнне прамысловага прыгарада Сучжоў, у якім спалучаліся б індустрыяльныя зоны з сумеснай вытворчасцю, дзелавыя, а таксама жылыя зоны. Геаграфічнае становішча забяспечвала доступ да: 1) вольнай для будаўніцтва плошчы ў 100 кв. км.; 2) выхад да ракі Янцзы; 3) непасрэдную блізкасць да Шанхая, найбуйнейшага міжнароднага цэнтра Кітая, які знаходзіцца ў 90 км. ад Сучжоў; 4) вялікі інфраструктурны і кадравы патэнцыял горада. Моўнае і культурнае падабенства Кітая і Сінгапура павінны былі садзейнічаць паспяховаму развіццю праекта. Тым не менш урады дзвюх краін разумелі, што для развіцця праекта спатрэбіцца не менш за дзесяць гадоў. Напрыклад, паводле сінгапурскага досведу, для стварэння прамысловага раёна Джуронг плошчай 60 кв. км. спатрэбілася 30 гадоў.

### Літаратура


1. Ли, Куан Ю. Сингапурская история. 1965–2000 гг. Из третьего мира – в первый / Куан Ю Ли. – Москва : МГИМО-Университет, 2010. – 656 с.
2. Wong, J. Singapore-Suzhou Industrial Park 20 Years On: Development and Changes / John Wong. – Singapore : World Scientific Publishing Co. Pte Ltd, 2020.


## Análise e comparação da gastronomia dos estados da República Federativa do Brasil


*Серая Е. А.,студ. I к. БГУ,*
*науч. рук. ст. преп. Синявская Ю. И.*


O Brasil não é somente um estado com elevado desenvolvimento econômico, mas também o país que ocupa a maior parte da América do Sul. A república é dividida em 26 estados e o Distrito Federal, que, de um modo ou de outro, diferem uns dos outros em cultura, tradições e costumes. Mas a gastronomia é exatamente uma das particularidades mais importantes no país do samba e do carnaval [1]. O propósito deste artigo é analisar e comparar a arte culinária em diferentes estados do Brasil.